Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 14. Варыянт 3**

**Білет 14. Практычнае заданне. Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. Палітыка генацыду насельніцтва Беларусі.**

**Заданні склала:**Гаравіц Наталля Пятроўна, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА "Сярэдняя школа №5 г.Светлагорска"

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Пра якія падзеі перыяду акупацыі сведчаць могілкі спаленых вёсак у Хатыні?
2. Абапіраючыся на крыніцы, вызначыце, якімі спосабамі знішчалі мясцовае насельніцтва акупацыйныя ўлады.
3. На падставе прапанаваных крыніц дакажыце, што акупанты праводзілі палітыку генацыду беларускага народа.
4. На падставе прыведзеных крыніц вызначыце, якія былі планы акупантаў адносна тэрыторыі Беларусі і беларускага народа.

**Крыніца І. Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь» – «Могілкі спаленых вёсак»**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца ІІ.Картасхема «Найбольш буйныя канцэнтрацыйныя лагеры і месцы масавага знішчэння савецкіх грамадзян на акупаваных тэрыторыях Беларусі»**




**Крыніца ІІІ. Канвенцыя аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго (прынята Генеральнай Асамблеяй ААН 9 снежня 1948 г.)**

У дадзенай Канвенцыі пад генацыдам разумеюцца наступныя дзеянні, якія здзяйсняюцца з намерам знішчыць, поўнасцю або часткова, якую-небудзь нацыянальную, этнічную, расавую або рэлігійную групу як такую:

а) забойства членаў такой групы;

б) прычыненне сур'ёзных цялесных пашкоджанняў або разумовага расстройства членам такой групы;

у) наўмыснае стварэнне для якой-небудзь групы такіх жыццёвых умоў, якія разлічаны на поўнае або частковае фізічнае знішчэнне яе;

гд) меры, разлічаныя на прадухіленне дзіцянараджэння ў асяроддзі такой групы;

д) гвалтоўная перадача дзяцей з адной чалавечай групы ў іншую.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі
**Адказы:**
**1.** Могілкі спаленых вёсак – гэта сведчанне знішчэння мірных жыхароў акупантамі, якія не шкадавалі ні дзяцей, ні старых (арт.102–103, ВАВ савецкага народа)
2. На тэрыторыі Беларусі размяшчаліся гета і канцэнтрацыйныя лагеры смерці, дзе людзей планамерна знішчалі, расстрэльваючы, атручваючы, спальваючы (ст.71-73)
**3.** Вызначаецца паняцце «генацыд», яго асноўныя прыкметы (арт.111-ВАВ савецкага народа), паказваецца на тое, што гэта злачынства супраць чалавечнасці.
**4.**Звесткі ўсіх трох крыніц гавораць аб тым, што палітыка, якую праводзілі нямецка-фашысцкія акупанты, – гэта генацыд беларускага народа (арт.75)